Уладзімір Трапянок

загадчык аддзела навін культуры дырэкцыі канала «Культура» Беларускага радыё, аспірант УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», магістр мастацтвазнаўства (г. Мінск, Беларусь)

# Спецыфіка рэпрэзентацыі драматычных спектакляў у інтэрнэце

Неад'емнай часткай жыцця сучаснага чалавека з'яўляецца камп'ютарная (дыгітальная) культура [2, *602*]. Звязкі чалавек-камп'ютар і камп'ютар-чалавек робяцца ўсё больш узаемаўплывовымі, калі карыстальнік актыўней паглыбляецца ў віртуальную прастору, стварае ў ёй спрыяльныя ўмовы для сябе і, такім чынам, садзейнічае развіццю камп'ютарнага асяроддзя і сеткаваму мастацтву ў інтэрнэце, якое атрымала найменне «net-art» [2, *602*]. Адным з яго відаў з'яўляецца драматычнае мастацтва ў лічбавым фармаце. Інтэрнэт як універсальная платформа для функцыянавання і распаўсюджвання розных відаў мастацтва і творчасці пашырыла межы існавання драмы і форм яе прэзентацыі, дакладней рэпрэзентацыі. Гэты лацінскі тэрмін разумеецца як «прадстаўленне», «паказ», «экспанаванне», «адлюстраванне», «аднаўленне», «дэманстрацыя» і інш. [1, *109*]. Больш дакладнае апісанне паняцця «рэпрэзентацыі» дала даследчык Т. Бабіч, якая сцвярджае, што рэпрэзентацыя выступае апасродкаваным, «другасным» прадстаўленнем першавобраза і вобраза, ідэальных і матэрыяльных аб'ектаў, іх уласцівасцей, адносін і працэсаў [1, *109*]. Спектаклі, пастаўленыя на сцэне, спецыяльна створаныя для яе, з'яўляюцца першавобразамі, арыгінальнымі творамі, адпаведна, сцэнічныя паказы адносяцца да працэсу «прэзентацыі». Запісаныя на тэатральных, вулічных і іншых пляцоўках, перанесеныя ў лічбавае асяроддзе інтэрнэт-парталаў творы, незалежна ад формы, зместу, працягласці і цэласнасці, з'яўляюцца рэпрэзентаванымі.

Маюцца адзінкавыя супрацьлеглыя прыклады, калі спектаклі ствараюцца спецыяльна для інтэрнэт-трансляцыі. Напрыклад, у снежні 2000 г. француз Янік Брэсан тры вечары запар разыгрываў 15-хвілінную п'есу «Мучанік». On-line дзеянне, арганізаванае страсбургскай Асацыяцыяй «e-toile», перадавалася ў сеціве з дапамогай некалькіх камер. 28-гадовы акцёр назваў паказ спектакля з кароткім жыццеапісаннем св. Эцьена сусветнай прэм'ерай інтэрнэт-тэатра. Па



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

тэхнічных прычынах паглядзець on-line трансляцыю міні-пастаноўкі змаглі толькі 60 чалавек [5, *215*]. Гэта прыклад прэзентацыі драмы.

Хацелася б звярнуць увагу на асаблівасці рэпрэзентацыі беларускага і расійскага драматычнага мастацтва, паколькі адсутнічаюць моўныя бар'еры і ўзаемазвязана развіццё дзвюх тэатральных школ. Прасочым, што змяняецца, страчваецца ці набываецца пры функцыянаванні драматычнага тэатра ў інтэрнэт-прасторы і наколькі шырока драма звязана з net-art.

Пачатак рускамоўнаму тэатральнаму інтэрнэту пакладзены ў 1996 г., калі тэатр «Майстэрня Пятра Фаменкі» адкрыла свой сайт. 15—22 кастрычніка 2004 г. адбыўся першы расійскі інтэрнэт-фестываль «Тэатральная павуціна» [5, *215*]. Арганізатары форуму ставілі перад сабой задачу адпрацаваць методыку жывой трансляцыі пастановак у сеціве. Для ўдзелу ў форуме былі запрошаны сем тэатраў, якія працавалі з рознымі відамі мастацтва драмы. Здымкі спектакляў вяліся трыма камерамі. Сам глядач вырашаў, які ракурс яму найбольш сімпатызуе. Для замежнай публікі былі зроблены англамоўныя субцітры. Прычым, калі да пачатку трансляцый стаць удзельнікамі інтэрнэт-фестывалю жаданне выказала каля 1000 чалавек, дык пад канец колькасць гледачоў павялічылася да 2139. Сігнал перадачы даных быў даступны для кожнага.



У кастрычніку 2010 г. у рунэце на партале www.teatrtv.com спектаклем «Хуліган» (з акцёрам С. Бязрукавым у галоўнай ролі) адкрыўся першы інтэрнэт-тэатр Расіі «Свабодная пляцоўка» [3]. Арганізатары заяўлялі, што гэта некамерцыйны праект для стварэння запатрабаванага тэатральнага прадукту. Планаваліся таксама абмеркаванні з удзелам пастаноўшчыкаў, выканаўцаў і тэатразнаўцаў. Але калі судзіць па тым, што партал www.teatrtv.com апошнім часам недаступны і адсутнічае інфармацыя пра іншыя паказы інтэрнэт-тэатра, праект, верагодна, спыніў існаванне.

Беларускі інтэрнэт-тэатр у рэжыме рэальнага часу налічвае два гады існавання: у жніўні 2013 г. на сайце www.charter97.org адбылася трансляцыя спектакля «Trash Cuisine» незалежнага Свабоднага тэатра (г. Мінск), які ўдзельнічаў у праграме Эдынбургскага тэатральнага фестывалю [4]. У кастрычніку 2015 г. трупа Свабоднага тэатра прапанавала інтэрнэт-карыстальнікам фестываль з 10 п'ес, які трансліраваўся ў сеціве два тыдні і прысвячаўся 10-годдзю калектыву.

Прыкладаў on-line трансляцый у Беларусі і Расіі зафіксавана нямнога. Прычыны палягаюць не ў незапатрабаванасці драмы ў інтэрнэце, бо колькасць актыўных карыстальнікаў глабальнай сеткі пастаянна павялічваецца, а ў двух фактах, якія апісаў даследчык С. Штэрнін:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сутнасць тэатра не ставіць на мэце збор, апрацоўку і захоўванне інфармацыі, як гэта адбываецца, напрыклад, у бібліятэках і музеях;

на развіццё камп'ютарызацыі і электронных фондаў бібліятэк і музеяў выдаткоўваліся грошы з бюджэту [5, *198*], у прыватнасці, расійскага. Прафесійным тэатральным калектывам няма патрэбы запампоўваць свае пастаноўкі. Не спяшаюцца выкладваць у інтэрнэце для ўсеагульнага доступу і прэм'ерныя работы, таму што па рэгламенце тэатральных фестываляў, у якіх можна паўдзельнічаць, спектаклі не павінны быць у шырокім доступе. Рэпертуарныя пастаноўкі таксама не прынята размяшчаць у сеціве, паколькі такім чынам можна пазбавіцца гледача ў театральнай зале і, як вынік, панесці матэрыяльныя страты. Зрэдку спектаклі, якія знаходзяцца ў ратацыі, можна ўбачыць у час юбілейных урачыстасцей ці ў межах фестываляў мастацтваў у тэлеэфіры каналаў «Беларусь–3» (Беларусь) і «Культура» (Расія), адпаведна, гэтыя творы робяцца даступнымі on-line ў інтэрнэце, паколькі каналы вядуць вяшчанне ў сеціве. Дарэчы, інтэрнэт-трансляцыя мае некалькі пераваг перад тэлевізійнай: фінансавыя выдаткі на паказ у сусветнай павуціне значна меншыя, з улікам агульнадаступнасці інтэрнэту on-line передача спектакляў у дзясяткі разоў павялічвае геаграфію гледачоў, садзейнічае абмену вопытам паміж прафесіяналамі.



Амаль усе дзяржаўныя тэатры Беларусі, за выключэннем Драматычнага тэатра Беларускай арміі і Паэтычнага тэатра аднаго акцёра «Зьніч», маюць уласныя сайты, падобныя па зместу і напаўненню. На іх размешчана гісторыя, кантакты для сувязі, афіша, творчы склад артыстаў і фотагалерэя са здымкамі спектакляў.

Пяць беларускіх драматычных тэатраў (Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Горкага, Беларускі дзяржаўны маладзёжны тэатр, Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі, Гродзенскі абласны драматычны тэатр, Гомельскі гарадскі маладзёжны тэатр) размясцілі на сваіх сайтах спасылкі на відэаролікі рэкламнага характару пра спектаклі бягучага рэпертуару, запампаваныя на сайце www.youtube.com. Гэты найбуйнейшы сусветны партал для размяшчэння відэа ўтрымлівае не больш за тры дзясяткі рэпрэзентатыўных спектакляў Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы, Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа, Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага рускага тэатра імя М. Горкага і Гродзенскага тэатра лялек. Там жа можна ўбачыць работы непрафесійных драматычных труп, якія для папулярызацыі, дэманстрацыі ўласнай дзейнасці актыўна выкарыстоўваюць таксама сацыяльныя сеткі.

Вельмі шырока ў сеціве рэпрэзентаваны пастаноўкі расійскіх тэатраў. Створаны дзясяткі сайтаў з сотнямі спектакляў, якія ўяўляюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сабой рэтраспектыву рускай тэатральнай школы ад моманту з'яўлення відэазапісу. Універсальны партал, які можна назваць алічбаваным архівам тэатральных пастановак, радыё- і тэлеспектакляў, балетных і оперных твораў, мае назву «Тэатраблог» (http://teatroblog.ru/spektakli-na-video). На партале захоўваюцца спектаклі амаль 30 драматычных калектываў: БДТ імя Г. Таўстаногава, Малога тэатра, Майстэрні П. Фаменкі, Маладзёжнага тэатра на Фантанцы, Маскоўскага мастацкага тэатра імя А. Чэхава, Тэатра-студыі А. Табакова, тэатраў імя Я. Вахтангава, М. Ярмолавай, тэатра «Современник» і інш. Зручная навігацыя дазваляе за некалькі секунд перанесціся ў віртуальную тэатральную залу.

Сайт http://adme.ru/svoboda-kultura/999-spektaklej-onlajn-750710/ таксама рэпрэзентуе спектаклі розных гадоў шматлікіх тэатраў Расіі. Багатая колькасць алічбаваных пастановак утрымліваецца ў відэаархіватары сацыяльнай сеткі «У кантакце» (www.vk.com), на якую спасылаецца сайт http://www.spektakli-online.ru, а таксама на відэапартале www.youtube.com, з якога рэпрэзентуе запісы сайт http://spektaklionlayn.narod.ru. Спектаклі дэманструюцца цалкам і фрагментальна, што дае магчымасць пазнаёміцца з творчым стылем рэжысёраў, найлепшымі акцёрскімі работамі і тэндэнцыямі развіцця расійскага тэатра за апошнія дзесяцігоддзі.



Пры рэпрэзентацыі спектакляў у інтэрнэце губляецца атмасфера, якая ўтвараецца ў глядзельнай зале, аднак рэжысёрскія задумы, праца мастака-сцэнографа, кампазітара, акцёрская ігра застаюцца навідавоку, уздзейнічаюць на інтэрнэт-гледача. Калі спектакль запісваецца з некалькіх ракурсаў (агульны, зблізку, збоку), у рэпрэзентатыўным выглядзе гэта надае твору больш выйгрышны варыянт, робіць тэатральную пастаноўку падобнай да кінастужкі ці тэлеспектакля. Хаця пры няўдалых здымках часам можа страчвацца агульная карціна дзеяння ці важныя буйныя планы выканаўцаў.

Шырока ў інтэрнэце прадстаўлены радыёспектаклі, запісаныя пераважна ў савецкі перыяд Беларусі і Расіі. Пастаноўкі для дзяцей і дарослых выкладзены ў свабодным доступе на розных сайтах рунэту (http://audioknigi.club/section/audiospektakli/, http://sheba.spb.ru/radio.htm, http://miraudiobook.ru/news/teatr_u_mikrofona/1-0-38 і інш.). Іх размяшчэнне ў сеціве стала магчымым дзякуючы запісу падчас on-line трансляцый станцый і каналаў, у эфірнай сетцы якіх маюцца радыёспектаклі. Беларускамоўныя аўдыяспектаклі, у т.л. сучасныя, можна паслухаць на сайце байнэту http://www.movananova.by/medyateka/litaratura/audyyoknigi-litaratura/. Рэпрэзентацыя радыёспектакляў надае ім «новае жыццё»,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пашырае даступнасць і дазваляе пачуць усе мастацкія вартасці, паколькі ствараюцца гэтыя работы па законах аўдыяўспрымання.

Такім чынам, інтэрнэт стаў зручнай платформай для рэпрэзентацыі драматычных спектакляў. Дыгітальная культура значна папоўнілася, дзякуючы рэпрэзентацыі драмы пераважна расійскіх тэатраў, пра што сведчыць вялікая колькасць запампаваных у сеціва рускамоўных пастановак. Тэатры Беларусі пакуль яшчэ робяць нясмелыя спробы заархівіраваць свае спектаклі ў глабальнай сетцы.

Тэатральныя on-line прэм'еры, якія больш падпадаюць пад вызначэнне «прэзентацыі», застаюцца адзінкавымі з'явамі net-art. Спектаклі ж другаснага, рэпрэзентатыўнага прадстаўлення сталі неад'емнай часткай камп'ютарнай культуры. Транслююцца яны на незалежных ад тэатраў-вытворцаў парталах. Дыгітальная культура садзейнічае пашырэнню драмы, якая ў фармаце net-art пры ўмове прафесійнага запісу амаль не страчвае сваіх мастацкіх вартасцей. Тэатр у інтэрнэце, апрача прамога прызначэння быць убачаным і асэнсаваным гледачамі, выконвае важныя асветніцкія функцыі, звязаныя з адукацыяй, навукай, пераемнасцю законаў тэатральных школ і мастацкіх традыцый розных краін і перыядаў.



*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. *Бабич, Т. Н.*, Понятие репрезентации в современном искусстве : теор. аспект / Т. Н. Бабич // Культура : открытый формат — 2013 : сб. науч. ст. / ред. сов. : В. Р. Языкович [и др.]. — Минск : БГУКИ, 2013. — С. 108—114.

2. *Карпілава, А. А.* Музычныя лабірынты дыгітальнага мастацтва / А. А. Карпілава // Беларусы. — Т. 12 : Экраннае мастацтва / рэдкал.: А. Красінскі [і інш.]. — Мінск : Беларус. навука, 2009. — С. 602—608.

3. Первый интернет-театр «Свободная площадка» открывается в Рунете // РИА Новости [Электронный ресурс]. — 2010. — Режим доступа : http://ria.ru/culture/20100929/280553011.html. — Дата доступа : 27.01.2015.

4. Спектакль Свободного театра — в прямом эфире charter97.org // Белорусская цифровая библиотека [Электронный ресурс]. — 2013. — Режим доступа : http://library.by/news2/culture/Spektakl-Svobodnogo-teatra-v-prjamom-ehfire-charter97-org/. — Дата доступа : 16.03.2015.

5. *Штернин, С. Л.* Театр и Интернет. Перспективы сотрудничества / С. Л. Штернин // Театр в книжной и электронной среде. Theatre in book and digital media : доклады Шестых науч. чтений «Театральная книга между прошлым и будущим»; сост. и науч. ред. А. А. Колганова. — М. : ФАИР-ПРЕСС, 2005. — С. 197—219.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ